действовали в благотворном для общества и государства русле. В данном случае важно учитывать то обстоятельство, что молодые протестанты - это прежде всего граждане нашей республики, а затем уже люди, исповедующие то или иное вероучение.

*В.Місюк, (БрДТУ, Брэст)*

## УСХОДНІЯ СЛАВЯНЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў СВЕЦЕ СУСВЕТНЫХ ПРАЦЭСАЎ (1921-39ГГ.)

Праблема міжкультурнай камунікацыі знаходзіцца ў цэнтры ўвагі амаль усіх гуманітарных навук (сацыялогіі, дэмаграфіі, культуралогіі, лінгвістыкі і г.д.). У сучасным свеце можна назіраць шэраг працэсаў, абагульненых пад назвай глабалізацыя, у аснове якіх ляжыць змена характару камунікацыі (транснацыянальнасць, трансгранічнасць і г.д.). Адным з праяўленняў глабалізацыйных працэсаў была мадэрнізацыя - станаўленне нацый новага тыпу. У першай палове XX стагоддзя назіраюцца выразныя тэндэнцыі змены грамадскай камунікацыі. Камунікацыя набывае масавы характар. Масавая культура носіць эгалітарны характар, спрыяе станаўленню нацыянальных культур (нацыянальнай адукацыі, прэсы, культурных таварыстваў, рэлігійных арганізацый і партый, тэрытарыяльнай аўтаноміі, рынкаў). Глабальная камунікацыя не магла абыйсціся без ўдзелу велізарнай колькасці людзей, для якіх інфармацыя павінна быць даступнай. Нацыянальная культура адпавядала гэтым патрабаванням.

Працэс мадэрнізацыі асноўваецца на перабудове старых рэгулятараў, стварае новыя, разбурае старыя, у выніку змяняецца напрамак і напружанасць камунікацыі. Увага асобных індывідаў і груп насельніцтва змяняе свой аб'ект і характар.

Тэрыторыя Заходняй Беларусі, а ў прыватнасці Палесся, неаднаразова даследчыкамі прадстаўлялася ў якасці *"трэцяга свету"* Еўропы, еўрапейскай Амазонкі, Галандыі, не толькі ў сэнсе добрай захаванасці прыроды палескіх рэк, але і ў культурным адносінах, у якасці *"крайне адсталай ўскраіны польскай дзяржавы"* [13, 12; 5, 28]. А ўвесь край, населены *"абарыгенамі"*, - як *„вельмі дзіўны, экзатычны"*, нетыпова еўрапейскі [4, 7; 6, 195]. Такім чынам, на першы погляд, тэрыторыя міжваеннай Заходняй Беларусі (1921-39гг.) ідэальна падыходзіла б на роль антыпода працэсаў глабалізацыі ў Еўропе.

Знешнепалітычная і ўнутрыпалітычная кан'юнктура была асноўным фактарам кансервацыйных працэсаў. Вядома, што пасля таго, як на сусветны рынак выйшлі такія краіны, як Злучаныя Штаты Амерыкі, Аргентына, правінцыі Брытанскай імперыі (Канада, Аўстралія, Індыя) папярэднія спажыўцы сыравіны з Заходняй Беларусі (жыта, дрэва, дзегця, спірта, ільну, сукна) атрымалі магчымасць набываць тыя ж або замяшчаючыя тавары па больш таннай цане. Таму доля Заходняй Беларусі ў еўрапейскай таргоўлі з паловы XIX стагоддзя пастойна скарачалася, тэмпы развіцця гаспадаркі адпаведна змяншаліся [7, 76]. Як адзначала Брэсцкая фінансавая палата, яна не была ў стане

"*паспяхова супрацьстаяць канкурэнцыі больш прадукцыйнай прамысловай вытворчасці і вырабам рамества іншых раёнаў*"[14, 18]. Шмат у чым жыхар Заходняй Беларусі быў поўнасцю выключаны з таварных адносін. А выпадкі, калі тавар быў вядомы ў Еўропе, меў сваю марку, былі надта рэдкімі[10, 103]. Гэта была адна з прычын захавання натуральнай гаспадаркі ў Заходняй Беларусі.

Адсутнасць на тэрыторыі Заходняй Беларусі вышэйшых навучальных устаноў магла сведчыць аб нізкім узроўні адукаванасці і абмежаванасці кругазору мясцовага насельніцтва. Стэрэатыпна лічылася што непісменнасць, у прыватнасці на Палессі, раўнялася 80%, а месцамі - 100% [2, 53]. Нізкая шчыльнасць насельніцтва, найменш развітая сетка дарожнай камунікацыі ў краіне, заняпад гарадоў таксама спрыялі нізкай прапускной здольнасці камунікацыйных рэгулятараў. [2, 69; 6, 12; 17, 185] Характарызуючы геаграфію дзейнасці БСРГ, польскія аналітыкі сцвярджаюць абсалютную залежнасць яе ад магчымасцяў камунікацыі: "*дзве чыгуначныя лініі Брэст-Баранавічы і Жабінка-Лунінец адзіныя* (на Палессі) *артэрыі ўздоўж якіх будуць адбывацца падзеі*".

Яшчэ адным рэгулятарам глабалізацыйнага працэсу стаў прыгранічны характар Заходняй Беларусі. Другая Рэч Паспалітая не падтрымлівала ажыўленых стасункаў са сваім усходнім суседам. Адной з прычын гэтага была цывілізацыйная місія дзяржавы на ўсходзе Еўропы ў якасці "буфера" (przedmurza) заходняга хрысціянства, еўрапейскага парламентарызму, дэмакратыі і г.д.. Адпаведна праз Заходнюю Беларусь не праходзілі асноўныя патокі міжнароднай таргоўлі і камунікацыі. Патрэбы ў іх эксплуатацыі не было.[15, 182]

З аднаго боку ў краіне адчувалася патрэба актыўных мер па ажыццяўленні мадэрнізацыі. З другога, па ацэнках шэрагу даследчыкаў, ва ўрадзе і мясцовай адміністрацыі было моцнае лобі кансерватараў, якое супрацьстаяла наваўвядзенням. Дзяржаўная палітыка выступала ў адношанні Заходняй Беларусі знешнім рэгулятарам, які ізаляваў гэтую частку краіны ад рэшты краю. Кансерватыўны характар гаспадаркі Заходняй Беларусі абумоўлены быў тым, што развіццё прамысловасці не адпавядала планам Генеральнага штаба.[6, 170-171]

Больш таго, у колах кансерватараў, нацыяналдэмакратаў падтрымлівалася ідэя "палесізацыі" Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Хаця пад назвай палешук разумеецца карэнны жыхар канкрэтнага культурна-гістарычнага рэгіёну, "палесізацыю" можна разглядаць як незалежную ад геаграфічнай лакалізацыі з'яву. Палесізацыя праводзілася як альтэрнатыва нацыяналізацыі. Палескасць звязавался з аморфным, архаічным, кансерватыўным, скрытным, руральным, пераважна малакамунікатыўным, ізаляваным ладам жыцця. [3, 149]

Палесізацыя асноўвалася на дэзінтыграцыі асобных усходнеславянскіх этнічных груп. Б.Тарашкевіч назваў яе, параўноўваючы з адпаведнай рэформай у сельскай гаспадарцы, культурнай "парцэляцыяй". Дэзіндэграцыя стрымлівала нацыяналізацыю тых асоб, якія маглі мець цяжкасці з этнаідэнтыфікацыяй. У гэтую катэгорыю залічвалі каля 400тыс. беларусаў-каталікоў, "засцянковую шляхту" (толькі на Палессі каля 100тыс.), лэмкаў, гуцулаў, "чырвонарусаў", тутэйшых (698 тыс. у

Палескім ваяводстве) і ўсіх "рускіх" або "русінаў" наогул[7, 26-32; 3, 68; 2, 50; 13, 49-50].

Дэзінтэграцыя выкарыстоўвалася для здабыцця падтрымкі адной з лаялісцкіх сіл у традыцыйным грамадстве (напрыклад святароў) і паступовага пераходу да мадэрнізацыі ў польскім нацыянальным варыянце (паланізацыі). Праяўлялася яна ў дзвух падыходах да суб'этнасаў: як да поўнасцю ізаляванай групы, або часткі польскага народу. Напрыклад, у Саюзе сельскай моладзі падтрымлівалася ідэя аб тым, што існуе асобны "*вольны народ палешукоў*", а ў колах каталіцкага кліру - што палешукі-каталікі - гэта "*пэўнай мерай беларусізаваныя, украінізаваныя, русіфікаваныя палякі*"[20, 29]. У 30-я гады колькасць палешукоў некаторымі даследчыкамі (Ф.А.Оссендоўскі) павялічвалася да 2 млн. чалавек, што дазваляла ўключыць у гэтую катэгорыю амаль усіх беларусаў Заходняй Беларусі. Тэндэнцыя да пашырэння "палесізацыі" відавочная [5, 72].

Чарговы метад "палесізацыі" - рэпрэсіі ў адносінах да ўсходнеславянскіх нацыянальных рухаў, захаванне манаполіі ў сферы нацыянальнага жыцця [2, 46; 11, 44; 17, 175; 12, 66]. Прычына незадавальнення нацыянальным рухам была ў тым, што паводле слоў ген.Янушайтіса "*кожны украінец* (адпаведна беларус і рускі) - *кандыдат у здраднікі дзяржаўных інтарэсаў*" [4, 164]. Іншаму, больш значнаму, палітычнаму дзеячу, Ю.Пілсудскаму, належаць словы аб тым, што "*маральная і інтэлектуальная вартасць* (беларускай інтэлігенцыі) *вельмі нізкая*" [11, 42]. Адпаведна, яе культура не можа быць культурай дзяржаўнага ўзроўня. Беларускі і ўкраінскі нацыянальны рух, з гэтага пункту гледжання, былі небяспечнымі ў любой форме [9, 176; 2, 93; 8, 34]. Тым больш, што ўздоўж усёй усходняй дзяржаўнай мяжы беларусы і ўкраінцы маглі прадстаўляць даволі значную сілу.

Унутрыпалітычная кан'юнктура была накіравана не толькі на захаванне кансерватыўнага характру Заходняй Беларусі (напрыклад "палесізацыя"), але і на яе мадэрнізацыю. Культурны і эканамічны стан усходніх славян разглядаўся ў шэрагу польскіх даследчыкаў і палітыкаў як праяўленне адмоўных рыс палітыкі царскай улады. Сялянам прыпісвалася прыродная схільнасць да "бальшавіцкага анархізму", які таксама быў прадуктам зваротнага боку рэчаіснасці Расійскай імперыі - расійскай анархіі. Перамена, якая адбылася тут "*ад трагічнай хвіліны раздзелаў*" ... „*пры панаванні рускіх, навучыла палешукоў недаверу і жаданню маўчаць*"[5, 74; 5, 133]. Асабліва схільнымі да анархіі прынята было лічыць праваслаўных. Хаця і беларускія хадэкі, пераважна каталікі па веравызнанні, не пазбеглі звінавачання ў бальшавізме. Польскае грамадства нібыта пыняло на сябе цывілізацыйную роль не дапусціць "бальшавісцкай анархіі" ў Еўропе, рэгіёне і краіне. З другога боку, рускія колы звязвалі актывізацыю украінскага і беларускага нацыянальных рухаў з дэмагагічным характарам польскай дэмакратыі. Яны сцвярджали, што польскі урад займаўся "*насаджэннем* ... *украінскага і беларускага "самостійнічества"*". І польскія, і рускія кансерватары выступалі супраць беларусізацыі і ўкраінізацыі. У гэтым

крыецца асаблівае беларускае і ўкраінскае разуменне кансерватывізма, як адзінства руска-польскай "чорнай сотні". [17, 137; 12, 77].

"*Польскі сялянін і польская культура*" павінны былі "*злучыць і звязаць назаўсёды*" Заходнюю Беларусь і цэнтральную Польшчу. Для гэтага патрэбна было паказаць прывабнасць польскай культуры і дабрабыту тым мясцовым жыхарам, ад якіх залежаў лад у Заходняй Беларусі (беларусам, украінцам і рускім). Пра тое, што мясцовае насельніцтва пачаткова аптымістычна ўспрыйняла ідэю ўтварэння новай польскай еўрапейскай нацыі сведчаць вынікі ППС-Л, ПСЛ-"Вызволене" і НПХ на выбарах 1922 года. Аднак у гэтай нацыі ўсходнім славянам адводзілася роль такая ж, як і кашубам. Ні ў літаратуры, ні ў адміністрацыі, ні ў царкоўным жыцці яны не атрымлівалі ніякай аўтаноміі. Адзіным запрапанаваным выхадам было безумоўнае прыняццё агульнанацыянальнага стандарта. Як вынік: палонафіламі засталіся толькі нязначныя групы беларускай, украінскай і рускай інтэлігенцый.[17, 175; 15, 112; 7, 156; 6, 28; 3, 66]

Пры ўсіх адзначаных абставінах неабходна прызнаць, што на тэрыторыі Заходняй Беларусі найбольш актыўным працэсам была мадэрнізацыя ў выглядзе этнанацыянальнай мадэлі. Існаванне нацыянальнага руху таксама насіла і мадэрнізацыйныя, і кансерватыўныя рысы. Напрыклад, ім прадугледжвалася захаванне пэўных традыцый (рэлігійных, моўных і іншых), існаванне якіх магло нават супярэчыць мэтам руху (напрыклад богаслужэнне на царкоўнаславянскае). У пераважнай жа большасці традыцыя трансфармавалася нацыянальным рухам праз набыццё агульнанацыянальнай каштоўнасці і сэнсу. Значна трансфармавалася структура ўзаемаадносін паміж прадстаўнікамі этнічных груп. На Заходняй Беларусі з'яўляецца невядомая раней нацыянальная кааперацыя, нацянальныя банкі, падпіска на нацыянальную прэсу. Праводзяцца шматлікія партыйныя, царкоўныя, грамадскія з'езды, школьныя акцыі. Нараджаецца музычная і тэатральная нацыянальная культура. Адзначаюцца, акрамя традыцыйных, нацыянальныя святы і юбілеі. Праводзяцца курсы, чытанні, выставы. [3; 73]

Існаванне нацыянальных арганізацый дазваляе прадстаўнікам Заходняй Беларусі прыймаць удзел у дзейнасці міжнародных арганізацый (Камінтэрну, Сельінтэрну, Прафінтэрну, Лігі Нацый). Дэлегаты нацыянальных меншасцяў выяжджалі ў Жэневу, Берлін, Маскву. Асабліва моцнае ўздзеянне на рэчаіснасць у Заходняй Беларусі меў чэхаславацкі парламентарызм. Следчыя органы Другой Рэчы Паспалітай неаднаразова адзначалі выразную нацыяналістычную накіраванасць асобаў, якія атрымалі чэхаславацкую адукацыю [19, 2-5].

Чарговы крытэрый ацэнкі тэмпаў мадэрнізацыі - сацыяльная мабільнасць. Напрыклад, колькасць рэпатрыянтаў сярод беларусаў пераўзыходзіла адпаведныя лічбы сярод іншых народаў Другой Рэчы Паспалітай. Толькі за гады польскай улады, па афіцыйных дадзеных, прыехала з бежанства 500 тысяч беларусаў[16, 52]. Штогод каля 75 тысяч з паўночнага ўсходу краіны выяжджала на сезонныя работы у Латвію. Параўнальна высокі працэнт (78 тыс.чалавек) рашыўся выехаць з Заходняй Беларусі ў іншую краіну на пастаяннае месца жыхарства. [16,

54]. Пераважна іміграваць вырашалі ўсходнія славяне. Такім чынам, каля 13% усяго насельніцтва была падрыхтавана да таго, каб перамяніць месца працы, а каля 25% было падрыхтавана да магчымых пераездаў.

Дастаткова хутка праходзіла нацыяналізацыя ўсходнеславянскага насельніцтва. У некаторых выпадках (асобных вёсак) яна ўжо пад канец 20-х гадоў дасягнула 90%. Адным з найбольш відавочных крытэрыяў з'яўляюцца выбары 1928 г. На гэтых выбарах за беларускія выбарчыя спіскі галасуюць у Навагрудскай акрузе 115,5 тыс. выбаршчыкаў. У Палескіх акругах усходнеславянскія спіскі сабралі больш за 200 тыс. галасоў [1, 49-50] . Толькі ўлічваючы гэты вынік, можна сцвярджаць, што 30% выбаршчыкаў выказалася ў падтрымку этнанацыянальнай мадэлі. Улічваючы тое, што ўсходнія славяне складалі каля 70-75%, то гэтую пазіцыю падтрымлівала амаль палова іх працаздольнай часткі насельніцтва. Станаўленне нацый і нацыянальнай свядомасці зацягнулася яшчэ на доўгія гады, а тэхнічныя магчымасці беларусаў, украінцаў і рускіх былі не на найлепшым узроўні. Таму працэнт уцягнутых у працэс мадэрнізацыі трэба прызнаць дастаткова высокім. Гэта дазваляе нам паставіць пад сумненне погляд на Заходнюю Беларусь, як на тэрыторыю некранутую працэсамі глабалізацыі ў першай палове XX ст..

Пры складанай знешнепалітычнай і ўнутрыпалітычнай кан'юнктуры тут, як і ў іншых месцах Еўропы, глабалізацыя знаходзіла даволі прыдатны грунт. Спрыялі гэтаму пераважна маладыя нацыі - беларусы і ўкраінцы. Адзіная спецыфіка рэгіёну заключалася ў тым, што ён не меў моцных цэнтраў нацыятворчых або рынкавых працэсаў і ў значна большай меры залежаў ад працэсаў, што адбываліся ў суседніх цэнтрах (Варшаве, Вільні, Мінску, Маскве). Уцэлым, грамадства Заходняй Беларусі можна лічыць добра падрыхтаваным да паскарэння глабалізацыйных працэсаў у 50-60гг. XXст..

КРЫНІЦЫ:


1. Bergman A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej - Warszawa: PWN, 1984.
2. M.Iwański Ukraińcy, białorusini, litwini i niemcy w Polsce w latach 1918-90 Siedlce: WSRP, 1993.
3. S.Krasucki Polesie - Bydgoszcz: Towarzystwo miłośników Wołynia i Polesia, 1998.
4. Mędrzecki M. Województwo wołyńskie 1921-39. Elementy przemian cywilizacyjnych, społecznych i politycznych Wrocław: Osolineum, 1988.
5. Ossendowski F.A. Polesie - Poznań: 1935.
6. Pietkiewicz Cz. Z etnografii Polesia Wołyńskiego//Wiedza i życie - 1929r. - Nr.8-9.
7. Tomaszewski J. Z dziejów Polesia 1921-39 - Warszawa: PWN 1963.
8. Tomaszewski J. Białorusini//Encyklopedia historii Drugiej Rzeczypospolitej - Warszawa: PWN, 1999.
9. Wisłouch S. Rola KPZB w ruchu Białorusinów w Polsce//Rocznik Instytutu Naukowo-Badawczego Europy Wschodniej t.1 - 1933.

10. Бодак А.Ю. Социально-экономическая жизнь г.Кобрина и кобринского уезда по состоянию на сентябрь 1939г.//Моладзь Берасцейшчыны - 1997г.
11. Вабішчэвіч А. Нацыянальная школа ў Заходняй Беларусі (1921-39гг.)// Беларуская мінуўшчына - 1998 - №1
12. Винниченко І. Українци Берестейщини, Підляшшя й Холмщини в пер.пол. XXст.. Хроніка подій - Київ, 1997.
13. Мисиюк В. «Москалефильство» и польско-украинская «Згода»// Моладзь Берасцейшчыны - 1999г.
14. Полуян В. А., Полуян И. В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920-39 гг. - Минск: Госиздат БССР, 1962.
15. Рудовіч С.С. Аляксюк Павел Паўлавіч//Энцыклапедыя гысторыі Беларусі т.1, Мінск: 1993.
16. Mały rocznik statystyczny - Warszawa: Główny Urząd statystyczny Rzeczypospolitej Polski, 1939.
17. Podział administracyjny państwa a zagadnienia narodowościowe// Sprawy narodowościowe T.V - 1996 - zesz.2(9)
18. Archiwum akt nowych (AAN) syg.296/II - 19
19. AAN syg.975/85
20. Дзяржаўны архіў Брэсцкай обласці ф.1оп.9с.1315

*Малыхіна Л.Ю. (БрДТУ, Брэст)*

## РЫЖСКІ ДАГАВОР 1921 г. У ДАКУМЕНТАХ "АРХІВАЎ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ"

Унікальнае выданне сусветнага значэння з'явілася пад канец XX стагоддзя - апублікаваны першыя 2 кнігі І тома зборніка дакументаў, якія тычацца ўзнікнення першай нацыянальнай дзяржавы ў беларусаў - "Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі" пад рэдакцыяй С. Шубы. Аўтарам былі апрацаваны малавядомыя матэрыялы з Літоўскага дзяржаўнага архіву і дакументы, якія знаходзяцца за мяжой у прыватных бібліятэках і сховішчах беларускіх аб'яднанняў. Як спадзяецца С. Шупа, далейшая публікацыя мінскага фрагменту дапаможа аднавіць поўную гістарычную карціну перыяда 1917-1925 гг. Багаты змест выдання - фотадакументы і лісты, ноты і дэкларацыі, цыркуляры і фінансавыя акты (усяго 3 837 дакументаў) - дазволіў увесці ў навуковы абарот новыя крыніцы і з новага ракурсу асэнсаваць галоўныя падзеі навейшай гісторыі. У прыватнасці, заключэнне мірнага Рыжскага дагавора 1921 г.

Акрамя непасрэдных удзельнікаў мірнай канферэнцыі ў Рызе - Савецкай Расіі, Украіны і Польшчы - існаваў яшчэ адзін зацікаўлены ў выніках перамоў бок - самі беларусы. Якім жа чынам урад Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) стаў змагацца за інтарэсы народа? Матэрыялы кнігі: пратэсты-прапановы ў міжнародныя органы, перапіска паміж членамі ўрада, даклады для службовага карыстання дапамагаюць саставіць уяўленне аб гэтым.